■ Рэха падзеі

# Інфармацыя — найвастрэйшая зброя

## Штогод беларускай арміі прысвячаецца каля 4 тысяч публікацый у друку, больш як 200 гадзін тэле- і каля 40 радыёэфіру

**Ужо дзясяты год запар падчас падвядзення вынікаў штогадовага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, патрыятычнага выхавання насельніцтва збіраюцца найлепшыя прадстаўнікі айчыннай журналістыкі — усе тыя, хто сваёй штодзённай працай дамогся высокіх вынікаў у творчым спаборніцтве.**



Фота Дзяніса МАЛЫШЫЦА.

**Першай прэміяй і дыпломам першай ступені ў намінацыі «Спецыяльны праект» адзначана і аўтарка гэтых радкоў, якая курыруе ў «Звяздзе» сумесны праект рэдакцыі і Міністэрства абароны «Плацдарм», прысвечаны беларускай арміі.**

— Выхаванне сапраўднага патрыёта, падрыхтоўка яго як абаронцы сваёй Айчыны, фарміраванне разумення і падтрымкі грамадствам мерапрыемстваў ваеннага будаўніцтва з'яўляюцца прыярытэтнымі задачамі ў паліцыцы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — Сёння мы маем права казаць аб высокай эфектыўнасці і рэзультатыўнасці супрацоўніцтва Узброеных Сіл і сродкаў масавай інфармацыі ў гэтай дзяржаўна значнай справе. Пры непасрэдным удзеле СМІ грамадскасць штодзённа знаёміцца з вынікамі дзейнасці беларускай арміі. Шмат у чым дзякуючы творчасці журналістаў у нашай краіне і далёка за яе межамі добра ведаюць аблічча сучасных Узброеных Сіл Беларусі.

Як заўважыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, пачуццё гонару перапаўняе за беларускую армію, за вялікі інфармацыйны фронт, дзе мы разам не проста кажам аб будаўніцтве Узброеных Сіл, аб выхаванні патрыятычных грамадзян нашай краіны, а разам умацоўваем нацыянальную бяспеку нашай дзяржавы. «Асабліва ў апошнія гады такія словы, як «да штыка прыраўнялі пяро», маюць асаблівую каштоўнасць і значэнне, — перакanана Лілія Ананіч. — Інфармацыя стала не проста сродкам данясення звестак аб тых ці іншых падзеях і з'явах, інфармацыя сёння — найвастрэйшая зброя. Вельмі важна, каб тэма развіцця Узброеных Сіл, любові да сваёй краіны, павагі да тых, хто гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону Айчыны, была сэнсам і галоўным зместам нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі».

Пераможцы конкурсу вызначаны ў 17 творчых намінацыях, якія ахапілі ўвесь спектр інфармацыйнай дзейнасці, усе сучасныя жанры, формы і спосабы асвятлення ваенна-патрыятычнай тэматыкі. Сёлета на конкурс было прадстаўлена 116 заявак ад сродкаў масавай інфармацыі, што на 10 % больш, чым у папярэднім конкурсным перыядзе.

Па словах **старшыні журы, памочніка міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёра Аляксандра ГУРЫ**, з кожным годам цікавасць да конкурсу расце, назіраецца актыўнасць рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, пашыраецца геаграфія ўдзельнікаў конкурсу.

Пры падвядзенні вынікаў асаблівая ўвага ўдзялялася адбору журналісцкіх твораў, якія спалучаюць у сваім змесце патрыятычную скіраванасць і пераемнасць найлепшых традыцый абаронцаў Айчыны, а таксама нязменную актуальнасць тэмы ўсенароднай абароны нашай Радзімы. Улічваліся кампетэнтнасць, аб'ектыўнасць і, безумоўна, крэатыўнасць журналісцкіх работ.

— Матэрыялы аўтараў на вайсковую тэматыку становяцца больш глыбокімі, — перакананы **член конкурснага журы, галоўны дырэктар Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Антон ВАСЮКЕВІЧ**. — Журналісты не проста апісваюць пэўную сітуацыю або павярхоўна расказваюць пра тое, што звязана з Узброенымі Сіламі нашай краіны, яны паглыбляюцца ў сам працэс, у якім вельмі добра разбіраюцца. І гэта перш за ўсё звязана з тым, што аўтары маюць магчымасць параўноўваць, як гэта было раней і як адбываецца цяпер. Журналісты імкнуцца аналізаваць, высвятляць тэндэнцыі і нават прадказваць пэўныя рэчы.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Смірна!

# ПАКАШТАВАЦЬ САЛДАЦКІ ХЛЕБ

## ЯК БАЙЦЫ МААП НА АДЗІН ДЗЕНЬ СТАЛІ ВАЙСКОЎЦАМІ

**Нядаўна ў адной з вайсковых часцей пад Мінскам з'явілася незвычайнае падраздзяленне — два дзясяткі хлопцаў з розных рэгіёнаў Міншчыны жылі армейскім жыццём: спалі і падымаліся па камандзе, праходзілі страявую, тактычную і агнявую падрыхтоўкі, наведвалі заняткі па радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароне (РХБА). Адна дэталь — «прызыў» доўжыўся ўсяго... суткі. Праект пад назвай «Адзін дзень у арміі» арганізаваў Мінскі абласны камітэт БРСМ з мэтай паказаць хлопцам, што служба ў войску можа быць па-сапраўднаму захапляльнай.**

У вучэбным памяшканні адной з казарм ідзе занятак: начальнік службы РХБА капітан Арцём Лаўрыненка тлумачыць «навабранцам» азы ваеннай навукі. Спачатку — тэорыя: як уплываюць на арганізм чалавека рэчывы, што могуць быць выкарыстаны ў якасці біялагічнай зброі, якія існуюць стадыі «прамянёвай хваробы», які парадак дзеянняў салдата ў выпадку атакі праціўніка. Але самае цікавае, вядома, — практыка. Адзін з добраахвотнікаў спачатку вучыцца правільна надзяваць процівагаз, а потым прымярае на сябе і ўвесь універсальны абаронны камплект. Пасля некалькіх хвілін у поўнай выкладцы твар хлопца мокры ад поту, але віду перад таварышамі ён не падае — «усё выдатна».

— Вядома, за адзін дзень усяго не расказаш, мы абмяжоўваемся самым кароткім курсам, — кажа капітан. — Аднак па ўласным досведзе ведаю, што пяці гадзін хопіць на тое, каб навучыць надзяваць універсальны абаронны камплект, процівагаз, рыхтаваць усе прыборы да працы. Таму гэта не проста азнаямленне, хлопцы нават за гэты час атрымаюць рэальныя веды, якімі змогуць скарыстацца ў любы момант.

Спатрэбіцца веды сапраўды могуць, бо ўсе ўдзельнікі ваенна-патрыятычнай акцыі «Адзін дзень у арміі» — байцы руху Маладзёжных атрадаў аховы правапарадку (МААП). Большасць з іх дапамагае праваахоўнікам, многія нават патрулююць вуліцы сваіх гарадоў разам з міліцыяй. Некаторыя плануюць звязаць сваю будучыню са службай у сілавых структурах. Акцыя БРСМ — выдатны шанц ацаніць перавагі знаходжання ў войску.

— Я родам з Салігорска, вучуся ў Любанскім сельскагаспадарчым прафесіянальным ліцэі, — расказвае ўдзельнік акцыі Глеб Забіяка. — Ужо прыкладна паўтара года ўдзельнічаю ў МААП. З усяго атрада маглі адправіць толькі аднаго чалавека, але мне пашчасціла. Гэта вельмі цікавы досвед, бо хутка я скончу навучанне і хачу планаваць будучыню ўжо цяпер. Мяне вельмі цікавіць служба ў войску, а тут такая шыкоўная магчымасць — адзін дэманстрацыйны дзень. Уражанні самыя найлепшыя. Я, шчыра кажучы, дагэтуль сумняваўся, але цяпер схіляюся ісці служыць — хутчэй за ўсё, буду спрабаваць трапіць у дэсантныя войскі.

Наступны занятак, напэўна, не мог пакінуць ніводнага хлопца абыякавым — зброя цікавіць усіх. У ролі настаўніка — інструктар маёр Андрэй Лаўранюк. Літаральна за паўгадзіны хлопцаў знаёмяць з ПМ і АК-74М, а таксама гранатамётам РПГ-7. Да стральбы справа не даходзіць, а вось няпоўная разборка і зборка «Калашнікава» — абавязковыя элементы праграмы.

У сярэдзіне дня МААПаўцы крочаць на абед. У сталовай вайсковай часці яны



ў прамым сэнсе пакаштуюць салдацкага хлеба. У меню — малочны суп, салата з капусты, грэчневая каша з курыным філе ў соусе, кампот і булкі, якія, дарэчы, пякуць тут жа. Пасля абеду — невялікі перапынак: спецыяльна для акцыі на тэрыторыі часці ўсталявалі вялікую штабную палатку. Менавіта тут хлопцы правядуць наступную ноч. Пакуль жа ўсе збіраюцца пагрэцца і падзяліцца ўражаннямі каля пераносных печак, якія ацяпляюць памяшканне.

Яўген Ёрш і Максім Лемеш — аднагрупнікі, прыехалі з Мар'інагорскага аграгтэхнічнага каледжа. У дзейнасці МААП яны ўдзельнічаюць нядаўна, але адправіцца ў вайсковую часць прапанавалі менавіта ім. Хлопцы сапраўды выглядаюць матываванымі: «Нам хацелася пакаштаваць армейскага жыцця, бо многія думаюць аднымі стэрэатыпамі, калі разважаюць пра службу ў войску. Якія ўражанні? Усё класна! З аднаго боку, тут сапраўды заўважаеш дысцыпліну і ідэальны парадак, але ніякай залішняй строгасці няма: з намі могуць і пажартаваць, і па-чалавечы дапамагчы, калі нечага не разумееш. З заняткаў пакуль больш за ўсё спадабалася страявая падрыхтоўка: здавалася б, вельмі простая справа, але мы, напрыклад, не ведалі, што аддаючы воінскае прывітанне, трэба далонь выцягнуць на 45 градусаў. У такіх дробязях — самае цікавае. Служыць абавязкова будзем, трэба толькі вызначыцца з войскамі, але гэта ўжо будзе залежыць ад здароўя».

Кульмінацыя мерапрыемства — імітацыя хімічнай атакі. Гэтым разам універсальныя абаронныя камплекты і процівагазы надзяваюць ужо ўсе «навабранцы», дадатковая нагрузка — аўтамат Калашнікава. У невялікім ляску запальваюць дымавыя гранаты. Задача хлопцаў — прабегчы і прапаўзці каля 50 метраў на ўмоўна заражанай хімікатамі тэрыторыі. З задачай усе спраўляюцца за некалькі хвілін. Здымаючы процівагазы, хлопцы выглядаюць стомлена, але сёння іх чакае яшчэ некалькі мерапрыемстваў — вольнага часу практычна няма.

— Такую акцыю мы вырашылі правесці ў рамках праекта «Да абароны Айчыны — гатовы!» і ў сувязі з Днём абаронцаў Айчыны, — кажа **першы сакратар Мінскага абласнога камітэта БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК**. — Выдатна, што камандаванне вайсковай часці паставілася да ідэі з разуменнем і змагло прыняць два дзясяткі найлепшых байцоў вобласці. Больш таго, вайскоўцы праявілі ініцыятыву і самі прапанавалі шэраг мерапрыемстваў.

Цікавая дэталь. Ініцыятарам акцыі «Адзін дзень у войску» была дзяўчына — камандзір Мінскага абласнога штаба МААП Кацярына Пышная. Актывістка расказвае, што ідэя нарадзілася ў выніку назірання за байцамі: нягледзячы на членства ў атрадах, многія сумняваюцца наконт сваёй будучыні. Пры гэтым адбор удзельнікаў праводзіўся па спецыяльным конкурсе, бо даць усім магчымасць адчуць сябе салдатам пакуль немагчыма.

— Калі БРСМ звярнуўся да нас з просьбай правесці такую акцыю, мы ўспрынялі ідэю станоўча, — адзначае **намеснік камандзіра вайсковай часці па ідэалагічнай рабоце падпалкоўнік Уладзіслаў ТРУМПЕЛЬ**. — Думаю, хлопцам было цікава, бо яны поўнасцю акунуліся ў атмасферу воінскай службы і пражылі паўнавартасны дзень па распарадку нашых салдат. Мы лічым, што праводзіць такія акцыі для моладзі ў дапрызыўным узросце проста неабходна, бо многія хлопцы сёння баяцца службы. Камандаванне вайсковай часці засталося задаволеным. Калі да нас яшчэ паступіць падобная прапанова, адказ будзе станоўчым.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*





Фота Надзі БУЖАН.

■ Годная змена

# Урокі патрыятызму і дабрыні

## За 18 гадоў існавання праз Цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі «Вектар», што ў Жодзіне, прайшло больш як тры тысячы падлеткаў

**Яны называюць сябе курсантамі, носяць ваенную форму і нават адгукаюцца на воінскія званні. Амаль прафесійна разбіраюць і збіраюць аўтамат Калашнікава, валодаюць воінскім статутам, з лёгкасцю адрозніваюць пагоны і практыкуюцца ў медыцыне — адным словам, гатовыя салдаты! Толькі большасці з іх да паўналецця яшчэ далёка...**

Не многія выпускнікі цэнтра сталі афіцэрамі. Але большасць юнакоў адслужылі тэрміновую службу, прычым на сяржанцкіх пасадах, засталіся ў арміі па кантракце. Астатнім засвоеныя ў цэнтры ўрокі патрыятызму і дабрыні спатрэбіліся ў іншых, не менш важных і адказных прафесіях.

### ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ — З МАЛЕНСТВА

Падобнай установы, у якой ужо са школьнай парты дзеці асвойваюць ваенную навуку, у краіне больш не існуе. Гэта не кадэцкія або ваенна-патрыятычныя класы, у якіх допрызыўная і медыцынская падрыхтоўка з'яўляюцца профільнымі прадметамі. У «Вектары» навучанне адбываецца па спецыяльнай праграме, распрацаванай заснавальнікам і нязменным кіраўніком цэнтра Ігарам Лазаравым, які летась стаў Чалавекам года Міншчыны.

— Падчас службы ў 30-й асобнай чыгуначнай брыгадзе я зразумеў, што позна юнаку, які прыйшоў у армію, тлумачыць, што такое патрыятызм, — расказвае кіраўнік Цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі, які тут і настаўнік, і інструктар у адной асобе. — Пра любоў да Радзімы трэба казаць раней: у школе, а яшчэ лепш у дзіцячым садку. Вось і хадзіў з аддзяленнем узвода аховы па школах, дзе знаёміў падлеткаў з вайсковай службай. Гэта быў якраз той момант, калі прыбралі з навучальнага працэсу дапрызыўную падрыхтоўку. І дарэмна, бо я ўбачыў у падлеткаў цікавасць да арміі, да ўсяго таго, што з ёй звязана.

**Пераапрануўшыся ў ваенную форму, выхаванцы цэнтра на некалькі гадзін забываюць пра цывільнае жыццё. Тут яны — курсанты.**

Разважанні доўгімі начамі ў каравуле выліліся ў адукацыйную праграму. Ідэю Ігара Лазарава падтрымала мясцовая ўлада, і неўзабаве ў Жодзіне з'явіўся цэнтр, дзе пачалі ладзіцца першыя заняткі па патрыятычным выхаванні.

### ЦЭНТР ЯК ШЛЯХ ДА ВЫПРАЎЛЕННЯ

У «Вектар» падлеткі прыходзяць пасля школьных урокаў. Заняткі пачынаюцца пасля таго, як выхаванцы пераапрануліся. Прычым не ў спецадзенне, а ў сапраўдную баявую форму! У кожнага з курсантаў ёсць і парадны камплект.



Ніхто прымусова на заняткі не ходзіць. Галоўнае правіла ў цэнтры — добраахвотнасць. Не прымуць у рады курсантаў і тады, калі будуць супраць бацькі. Праўда, падобных выпадкаў за ўсю гісторыю існавання цэнтра не было. Хутчэй наадварот.

— Чаго граху таіць, сёння няма нямала няпоўных сем'яў, дзе маці самастойна выхоўваюць сваіх дзяцей, — гаворыць Ігар Лазараў. — Адчуваецца, што недахоп бацькоўскага выхавання адбіваецца на фарміраванні асобы хлопчыка. Жанчыны разумеюць гэта, таму прыводзяць сваіх сыноў да нас.

У цэнтры займаюцца пераважна падлеткі, якія плануюць звязаць свой лёс з сілавымі структурамі. Але ёсць тут і іншыя хлопцы. Па просьбе настаўнікаў трапляюць у «Вектар» недысцыплінаваныя вучні. Некаторыя жартам называюць цэнтр ваенізаванай папраўча-працоўнай калоніяй. І трэба сказаць, «рэабілітацыя» адбываецца на вачах.

— Шчыра кажучы, у нас навучаецца не толькі самыя лепшыя вучні ў школе, — прызнаецца Ігар Аляксеевіч. — Ёсць такі Коля, які ў школе — галоўны парушальнік дысцыпліны. На занятках у цэнтры хлопчык дзіўным чынам мяняецца, часам яго нават можна ставіць у прыклад. З Колі не будзе дырэктара, кіраўніка прадпрыемства, але ён абавязкова стане добрым хлопцам, ваеннаслужачым, мужам і бацькам. Добрым быць цяжка, але яму, як і многім выхаванцам, падабаецца быць такім. Паступова гэты вобраз пераносіцца ў рэальнае жыццё.

### АД ПРЫСЯГІ ДА АБАРОННА-СПАРТЫЎНЫХ ЛАГЕРАЎ

Пераапрануўшыся ў ваенную форму, выхаванцы цэнтра на некалькі гадзін забываюць пра цывільнае жыццё. Тут яны — курсанты.

Праўда, перш яны прымаюць прысягу. Ёсць у выхаванцаў і свой «крапавы» берэт. Але насіць яго мае права толькі той, хто здаў экзамены і двойчы быў у абаронна-спартыўным



лагеры. Выхаванцы, якія не вытрымалі выпрабаванні, носяць камуфляваныя берэты.

Цэнтр — унікальная супольнасць абсалютна розных, не падобных адзін да аднаго падлеткаў. З дарослых тут толькі кіраўнік. Астатнія «штатныя» пасады — начальнік штаба, намеснік па тыле, старшына, санінструктар, камандзіры аддзяленняў — займаюць курсанты. Адным словам, дзіцячае самакіраванне.

Акрамя дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі, выхаванцы цэнтра асвойваюць ваенную гісторыю, вывучаюць традыцыі свайго краю. Менавіта дзякуючы самім курсантам, а таксама іх кіраўніку ў «Вектары» быў створаны пакой гісторыі, які нагадвае міні-музей.

— У гэтым пакоі дзеці даведваюцца, што такое абарона Айчыны, хто яны, абаронцы, — кажа Ігар Лазараў. — Важна растлумачыць, што абаронца Радзімы — гэта не толькі салдат з аўтаматам у руках. Гэта і настаўнік, які дае чалавеку пуцёўку ў жыццё, і ўрач, які адказвае за наша здароўе, і камбайнёр, дзякуючы якому ў крамах з'яўляецца хлеб, і нават той жа школьнік, які трымае абарону нашай дзяржавы падчас вучобы...

Каб больш паглыбіцца ў армейскае жыццё, на асеннія, зімнія і вясеннія канікулах для выхаванцаў арганізоўваюцца трохдзённыя ваенізаваныя зборы. Для начлегу ў цэнтры ўладкаваны спецыяльныя спальныя пакой, ёсць і сталовая, якая хутчэй нагадвае палявую кухню. Але ў найбольш прыбліжаныя да арміі ўмовы курсанты трапляюць падчас летніх лагераў, якія ў розны час праходзілі на тэрыторыі 72-га аб'яднанага навучальнага цэнтра, Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня», на іншых пляцоўках. Летні лагер — выдатная магчымасць прадэманстраваць выхаванцамі тое, чаму яны навучыліся ў цэнтры.

### А ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ — МЕДЫЦЫНА

Навучаюцца ў «Вектары» і дзяўчаты. Тут іх называюць сонейкамі, а яны, у сваю чаргу, не карыстаюцца гендарнай перавагай і нароўні з хлопчыкамі выконваюць пастаўленыя задачы. І трэба сказаць, праяўляюць яшчэ большыя поспехі, чым юнакі. Многія з іх, налаўчыўшыся тут аказваць першую дапамогу, улюбіліся ў медыцыну і сталі ўрачамі, медсёстрамі. Хлопцаў адсюль праводзяць у армію. Некаторыя, хто ў свой час займаўся ў цэнтры, ужо дaслужыліся да падпалкоўнікаў.

Мараць пра афіцэрскія пагоны і віцэ-яфрэйтар Артур Нарубаў, курсанты Алег Адзінец, Уладзіслаў Сузен і Мікалай Малючэнка. Нягледзячы на агульныя інтарэсы, хлопчыкі вельмі розныя. Улад — спакойны, дысцыплінаваны, поўная супрацьлегласць Колю. На пытанне, чаму прыйшоў у цэнтр, Улад адказвае, што даўно захапляецца ваеннай тэмай, а таксама з двух гадоў — у ботах (насіць дзіцячае абмундзіраванне, якое набыла яму мама).

Коля не з катэгорыі выдатнікаў. На яго думку, каб стаць сапраўдным абаронцам Айчыны, неабавязкова добра вучыцца. Тым больш хлопчыку ёсць на каго раўняцца: прадзед ваяваў у гады Вялікай Айчыннай, дзядуля служыў у Афганістане, дзядзька — малодшы сяржант.

— І ты будзеш вайскоўцам? — пытаюся ў Колі.

— Абавязкова! Хачу служыць там, дзе і брат: у спецназе.

Улад жа марыць пра пагранічныя войскі. У той час, як іх аднакласнікі гуляюць у камп'ютарныя гульні і праводзяць час за іншымі малакарыснымі забавамі, хлопцы чатыры разы на тыдзень робяць усё дзеля таго, каб наблізіцца да сваёй мары.

Як лічыць кіраўнік «Вектара», сучасныя дзеці вельмі шмат ведаюць дзякуючы камп'ютарным гульням. «Сапраўды, часам там ёсць нешта карыснае, але ўсё гэта ў тэорыі, — перакананы Ігар Лазараў. — Калі ў рэальнай абстаноўцы ім давядзецца падняць люк танка або спатрэбіцца зарадзіць магазін аўтамата, тут тэорыі мала: патрэбны сіла і трываласць. Гэта ў гульні ёсць тры жыцці, на справе ж усё далёка не так...»

### ВАЙСКОВЕЦ ПА СПАДЧЫНЕ

Ігар Аляксеевіч для выхаванцаў — прыклад для пераймання. Ён для іх і настаўнік, і лепшы сябар. Як прызнаюцца курсанты, могуць падзяліцца з ім самым запаветным, а калі трэба, папрасіць парады.

Цэнтр для Лазарава стаў другім домам, а выхаванцы — членамі сям'і. Між іншым, тое, чым ён займаецца, у прамым сэнсе перадалося яму на генетычным узроўні. Бацька — кадравы вайсковец, маці ўсё жыццё адпрацавала ў дзіцячым садку. Ваенная дынастыя Лазаравых увогуле пачалася з дзядоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

— Бацька служыў у марской авіяцыі, увесь час па ваенных гарнізонах, таму іншага жыцця шляху я для сябе нават не ўяўляў, — прызнаецца Ігар Аляксеевіч. — Для мяне ўвогуле было дзіўным, як гэта — хадзіць на работу: у маёй сям'і служылі.

Дарэчы, самога Ігара Лазарава ў ваеннае вучылішча не прынялі па здароўі, але ён знайшоў выхад. Прызваўся на тэрміновую вайсковую службу, пасля чаго гвардыі сяржант застаўся ў арміі па кантракце. Адданая арміі і жонка, старшы сяржант медыцынскай службы. Адслужыў тэрміновую службу старэйшы сын, малодшы — пакуль віцэ-сяржант у цэнтры, дзе пануе атмасфера савецкага часу, калі ўсе былі адзінай сям'ёй.

— Сёння кожны жыве ў сваім тэлефоне, — лічыць кіраўнік цэнтра. — Па вялікім рахунку, падлеткам усё роўна, чым займаецца іх равеснік. У Савецкім Саюзе мала сустракалася такіх выпадкаў, калі кожны быў сам за сябе. Цяпер у дзіцяці, які едзе ў аўтобусе, нават няма думкі аб тым, што старэйшаму трэба саступіць месца. І калі спрабуеш з ім размаўляць, то чуеш, што мама сказала рабіць так, каб добра было толькі яму. Я ж выхоўваю курсантаў у тым ключы, каб добра было навакольным, каб іх укараных ганарыліся бацькі, настаўнікі, аднакласнікі...

* * *

Сёння ў Цэнтры патрыятычнага выхавання моладзі — свята. Адзначаючы дзень нараджэння сваёй альма-матэр, выхаванцы збяруцца за салодкім сталом у імправізаванай палявой кухні, абдымуць адзін аднаго і па традыцыі заспяваюць: «Как здорово, что все мы здесь сегодня собрались...»

**Вераніка КАНЮТА.** kanyuta@zviazda.by

г. Жодзіна